https://nashaniva.com/348588

«Такіх клоўнаў назбіралася мноства». Ціханоўскі пайшоў у фэйсбук адказваць беларусам

«Я магу рабіць усё што заўгодна. А некаторыя толькі брахаць і смярдзець».

На працягу года пасля вызвалення Сяргей Ціханоўскі быў слаба прадстаўлены ў сацыяльных сетках. Але апошнім часам ён актывізаваўся — завёў сабе ютуб-канал з вершамі, аднавіў доступ да [старонкі](https://www.facebook.com/SergeyTihanovski) ў фэйсбуку. Прычым цяпер Ціханоўскі не толькі піша свае допісы, але каментуе чужыя.

Палітычны аналітык Аляксандр Класкоўскі напісаў для «Белсата» калонку пад назвай «Ціханоўскі: ваяваў з рэжымам, зараз будзе весці вайну з медыямі?» і [запосціў](https://www.facebook.com/klaskouski/posts/pfbid0hWAtwUqhiFuDR9fZLdDKojcfwymLib9JyFsj128mKX7T83FTaL5zDuSU4QWqHtpel?__cft__%5B0%5D=AZYFdAZJjznUUZXvMLok9YhE_vbhCZK1w1GIb7cb7vPytucJ3g5lJep9AL50QfD4wjENXHHmOopTjOq42J1EvlSH1WXBKbkP1brQ4HDBfeZSUrE4u5naaIKMAqSDY7tQp3iZ_vkQ3c7ehRtrKGY8APA1YVQZ9ArYGTvE6k2tshpiDw&__tn__=%2CO%2CP-R) вытрымкі з яе на сваю старонку ў фэйсбуку.

«Вы напісалі матэрыял, які паказаў, хто вы! На жаль, такіх клоўнаў у СМІ і каля СМІ назбіралася мноства. Матэрыял выглядае заказухай. Калі гэта ваша меркаванне — мне вас шкада. Вы перакруцілі і сказілі факты. Але гэтае балота ўжо ніхто не выратуе)))», — пракаментаваў яго Ціханоўскі.

Ціханоўскаму прапанавалі: «Ну дык працягніце думку: «Насамрэч я…».

«Чытай мой пост, а не клоўна», — адрэзаў палітык.

Калі выказалася былая палітзняволеная Наталля Дуліна — і, хутчэй, падтрымала Ціханоўскага, — Класкоўскі адказаў ёй, што прэтэнзіі да публікацыі ў медыя можна выказваць у адказе, абвяржэнні ці нават падаць у суд, бо гэта нармальны цывілізаваны шлях у адрозненне ад збору нейкага дасье для донараў.

«Я магу рабіць усё што заўгодна. А некаторыя толькі брахаць і смярдзець», — уключыўся ў дыялог Ціханоўскі.

Не прайшоў ён міма і [допісу](https://www.facebook.com/NKostyugova/posts/pfbid02nVgmHXk5PVvCcaEiEPAhr5c15unS4j35N5qJMQe1yZ1Hyqt6XKVMfR3G6EFRnktal?__cft__%5B0%5D=AZblsAuTTwX6NwLKSONWEeleqQZpUUlWgmwKcS5OHEHaZ-CjDH4bh8_tArO0F_jgu4dMBpA0pFTPqHZB9Q9n3--NgHAKvurF5bpJg8H1SRsF9znYnD_Z9usSwkDn8orswV6XaSWLvVKyyH1pVkzbrfghOTSDXOtp0M3BnL9pDJKyNg&__tn__=%2CO%2CP-R) Настасці Касцюговай. Яна паіранізавала, але бадай што па сутнасці таксама падтрымала Ціханоўскага: «Ну ўсё ж бачу пэўную эвалюцыю ў фэйсбуку. Тусоўку Ціханоўскага ў Лос-Анджэлесе аднадушна прызналі даволі сціплай, гэта радуе. Уяўленні аб дазволеным беларусу ўзроўні задавальнення ад жыцця пашырыліся да торціка з колай у Каліфорніі. Прагрэс, на які я і не смела спадзявацца».

«Насця, а пра што допіс? Проста адзначылася? Ці ёсць што сказаць?)))», — звярнуўся да яе Ціханоўскі. Касцюгова адказваць не стала.

Каментары39

Як быў рускамірнутым хамам, гэтак і застаўся.